«Храм наш агульны і светлы...»

Іван САВЕРЧАНКА,
доктар філалагічных навук

Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч (26.11.1930 – 25.7.1984) – выдатны беларускі пісьменнік, паэт, драматург, публіцыст і перакладчык. Ён пакінуў багатую літаратурна-мастацкую спадчыну. Перадусім, чатыры бліскучыя раманы – «Нельга забыць», «Каласы пад сярпом тваім», «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», «Чорны замак Альшанскі», а таксама геніяльныя аповесці – «Дзікае паляванне караля Стаха», «Сівая легенда», «Цыганскі кароль», «Ладдзя роспачы», «Чазенія». Пяру пісьменніка належаць каля двух дзясяткаў апавяданняў, сярод якіх найбольш дасканалыя ў мастацкім плане «Блакіт і золата дня», «Дрэва вечнасці», «Залаты бог». Майстар слова літаратурна апрацоўваў народныя паданні і казачныя сюжэты. Меў непаўторны талент драматурга – ён аўтар выдатных п'ес «Млын на Сініх Вірах», «Кастусь Каліноўскі», «Званы Віцебска», «Калыска чатырох чараўніц», «Маці ўрагану». У. Караткевіч стварыў шматлікія паэтычныя шэдэўры – балады, паэмы і лірычныя вершы, напісаў бліскучы нарыс «Зямля пад белымі крыламі».

ФІЛАСОФІЯ ТВОРЧАСЦІ

Асноўны пафас твораў У. Караткевіча – барацьба беларускага народа за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, шанаванне нацыянальнай спадчыны, абарона беларускай мовы і фальклору, фарміраванне высокіх ідэалаў дабра, годнасці, патрыятызму, самаахвярнага служэння Айчыне.

Дамінантная рыса творчасці У. Караткевіча – інтэлектуальнасць і глыбокая філасафічнасць, якія ўвасоблены на ўсіх мастацкіх узроўнях, ва ўсёй ідэйна-вобразнай матрыцы яго літаратурных твораў. Выбар тэм і персанажаў, ідэалы і каштоўнасці герояў, асноўныя матывы твораў і грунтоўныя аўтарскія разважанні прадыктаваны канцэптуальна выверанай пазіцыяй пісьменнніка, яго адметнай глыбока гуманістычнай сацыяльнай філасофіяй.

У. Караткевіч залічаў сябе да прыхільнікаў Гуманізму, які ўзнік у Італіі як альтэрнатыва каталіцкай рэакцыі і стаў вызначальнай тэндэнцыяй у гісторыі інтэлектуальнай думкі Еўропы. На погляд пісьменніка-інтэлектуала, ідэалогія Гуманізму – «гэта рошчына вечнага неспакою, таму што гэта адзіная ерась, якая не стане верай і догмай» *[1, т. 6, с. 20]*.

Галоўны ідэал у іерархіі гуманістычных каштоўнасцей У. Караткевіча – «воля». Вызваленне ад сацыяльнага ўціску, поўнае разняволенне народнага духу, раскрыццё творчага патэнцыялу асобы, паводле слушнага меркавання пісьменніка, – галоўная крыніца стваральнай энергіі. У. Караткевіч выступаў за прадастаўленне шырокіх магчымасцей для рэалізацыі таленту ўсіх людзей, за рэлігійныя свабоды, роўнасць перад законам, незалежна ад сацыяльнага статусу. Герой яго твора разьбяр Кляонік кажа: «Не павінна быць розніцы ў законе, розніцы між каралём і народам, між тым, хто царуе, і тым, хто арэ, між плебеем і шляхціцам, а павінна быць усё для ўсіх, агульнае і роўна, і воля павінна быць на зямлі і на небе, а веруй, як хто хоча» *[1, т. 6, с. 52]*.

Найвялікшая каштоўнасць для пісьменніка – родная Беларусь. У. Караткевіч захапляўся і ганарыўся велічным мінулым роднага краю, узносіў гімны гераічным асобам, апяваў прыгажосць непаўторных краявідаў, марыў пра вольную і заможную

ПРА АЎТАРА

САВЕРЧАНКА Іван Васільевіч.

Нарадзіўся ў 1962 годзе ў в. Малінаўка Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыў Магілёўскі педагагічны інстытут (1983). З 1988 года працуе ў Інстытуце літаратуры (цяпер – Інстытут мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы) Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – вядучы навуковы супрацоўнік.
Доктар філалагічных навук (2001).
Аўтар больш як 150 публікацый па праблемах філалогіі і гісторыі, сярод якіх 7 манаграфій.
Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя беларускай літаратуры.

Беларусь. Адметныя назвы беларускіх вёсак, паселішчаў і ўрочышчаў выклікалі глыбокае ўзрушэнне пісьменніка і яго герояў.

Аксіёмай для У. Караткевіча з'яўлялася адзінства нацыі, гістарычныя перспектывы яе развіцця. У канцэптуальным вершы «Бог пайшоў...» паэт даводзіў, што сапраўдны гонар, шчасце і ўзнагарода для кожнага грамадзяніна – праца і самаахвярнае служэнне на карысць сваёй Айчыны і народа:

Бог пайшоў. Жыццё ідзе пад кручу.
Але йдзі і не губляй спакой.
Ёсць замест прыватнай неўміручасці –
Бессмяротнасць нацыі тваёй *[1, т. 1, с. 394]*.

Родная зямля, чыстыя рэкі і блакітныя азёры, урадлівыя палі і лугі, багатая духоўная і мастацкая спадчына для У. Караткевіча – неацэннае багацце, сапраўдны скарб, які належыць зберагаць і ўзбагачаць. Яго верш «Беларуская песня» – прысяга паэта на вернасць Радзіме, беларускаму народу, матчынай мове. У гранічна шчырай клятве майстар слова выказаў гатоўнасць самаахвярна служыць роднай зямлі, аберагаць яе ад усялякіх ворагаў, бараніць яе гонар і славу. У гімнічным вершы «Снягір» паэт захапляецца роднай краінай, яе славай і перамогамі, прызнаецца ў бязмежнай любові да яе.

Аднак У. Караткевіч не замыкаўся ў вузка нацыянальных межах, ён выдатна ўсведамляў выключную каштоўнасць сяброўства і ўзаемападтрымкі народаў свету, што з'яўляецца трывалым падмуркам супольнага поспеху і росквіту. У праграмным вершы «Быў. Ёсць. Буду» ён выказаў цвёрдую ўпэўненасць, што беларусы, поплеч з іншымі народамі свету, у хуткім часе ўзвядуць і цудоўна аздобяць «храм наш агульны і светлы» *[1, т. 1, с. 239]*.

Як пісьменнік-інтэлектуал У. Караткевіч прапанаваў канструктыўную філасофію нацыянальнага выжывання, якая грунтавалася на асэнсаванні гістарычнага шляху народа і веданні палітычных рэалій часу. На яго думку, заўсёды належыць адшукваць эфектыўныя сродкі змагання і найбольш прымальныя формы дзейнасці, якія б далі магчымасць нацыі выжываць у найскладанейшых абставінах. Галоўнае для нацыі – кансалідацыя і ўзаемадапамога. Калі народ паверыць у свае сілы, ён здолее перамагчы любога ворага, усталяваць справядлівасць і прымусіць паважаць сябе. Паводле яго перакананння, заўжды перамагаюць тыя, хто верыць у светлы пачатак, хто бароніць людзей, гатовы ахвяравацца дзеля іншых.

Уладзімір Караткевіч з бацькамі і роднымі пасля заканчэння Кіеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Т. Шаўчэнкі. Орша, 1955 год

Адстойваючы неабходнасць патрыятычнага выхавання грамадзян краіны, У. Караткевіч зыходзіў з таго, што чалавек, калі ён хоча мець поспех, выстаяць пад націскам розных выпрабаванняў, ніколі не павінен забывацца на тое, хто ён і адкуль ён. Вернасць Радзіме, адданае служэнне роднай зямлі, матчынай мове – базавы прынцып жыццёвай філасофіі пісьменніка.

У. Караткевіч падкрэсліваў адказнасць кожнай асобы за ўласныя ўчынкі. Чалавек, паводле яго слоў, надзелены свабоднай воляй, і ён сам робіць выбар, з кім яму быць – з Богам ці з Сатаною. Каб перамагаць у жыцці, дасягаць пастаўленых мэт, належыць мець дасканалы розум і, галоўнае, дзейнічаць смела, энергічна, неардынарна. Героі У. Караткевіча амаль заўсёды дэманструюць максімалісцкі падыход да жыцця. Васіль Вецер у «Маці ўрагану» сцвярджае: «Бо лепей загінуць нават у катоўні, нават у агні, чым згнісці жыўцом» *[1, т. 8, кн. 1, с. 239]*.

У. Караткевіч – нязломны гуманіст і аптыміст, ён верыць у магчымасць духоўнай эвалюцыі грамадства, бачыць добры пачатак у кожным чалавеку. Вуснамі героя Свеціловіча пісьменнік адзначае: «Чалавек добры, а з яго робяць жывёлу. Ніхто, ніхто не хоча даць яму магчымасць быць чалавекам. Відаць, нельга проста крыкнуць: «Абдыміцеся, людзі!» *[1, т. 7, с. 130]*. На свеце, даводзіў пісьменнік, шмат сумленных і шчырых людзей.

Ён вельмі выразна адрозніваў дабро ад зла. Асабліва грэбліва ставіўся да здраднікаў: «А яны ўсе, ці ведаеце, думаюць, што здрада дужа выгаднае рамяство. А здрада рамяство яшчэ і дужа небяспечнае» *[1, т. 8, кн. 1, с. 297]*. Здрада заўсёды прымаецца, адзначае драматург, але «здраднікa вешаюць».

Пісьменнік выказваў занепакоенасць тым, што зло на зямлі не знішчана дарэшты. Аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха» ён скончыў словамі, у якіх гучала трывога за будучыню зямлі: «У жахлівым маўчанні шалёна скача над зямлёю дзікае паляванне караля Стаха. Я прачынаюся і думаю, што не прайшоў ягоны час, пакуль ёсць цемра,

голад, нераўнапраўе і цёмны жах на зямлі. Яно – сімвал усяго гэтага. Хаваючыся напалову ў тумане, імчыць над змрочнай зямлёй дзікае паляванне» *[1, т. 7, с. 197]*.

У. Караткевіч – жыццялюб і эстэт, ён бачыць шмат цікавага і прыемнага, радаснага і любаснага. Нягледзячы на бязладдзе на зямлі, несправядлівасць, здраду і подласць, пісьменнік не губляе веру ў чалавека, перамогу дабра над злом, прыгожага над пачварным. Вуснамі Кастуся Каліноўскага, які спрачаецца з Мураўёвым, ён выказаў веру ў надыход шчаслівых часоў для чалавецтва, усталяванне справядлівасці і праўды: «Кожны раз чалавецтва бліжэй да шчасця... на вышыню нашых магіл. З крывёю, са зрывамі на дно прорвы, яно, здыхаючы, паўзе да праўды» *[1, т. 8, кн. 1, с. 89]*.

Паводле У. Караткевіча, служэнне Радзіме, змаганне за волю, вернасць каханню – найвышэйшыя ідэалы. Пісьменнік верыў ва ўсталяванне сацыяльнай справядлівасці, роўнасць народаў, росквіт нацый і моў. Вуснамі станоўчага героя Васіля Ветра ён па-біблейнаму прарочыць: «Пройдуць тысячы год. Што тут будзе тады? Напэўна, ніхто не будзе адбіраць у іншага хлеб і гонар. Не будзе большага і меншага, эліна або іудзея. І кожная мова будзе панскай, а таго, хто яе саромеецца, будуць закідваць багном» *[1, т. 8, кн. 1, с. 241]*.

У п'есе «Кастусь Каліноўскі» пісьменнік агучыў свой духоўны запавет, выказаў веру ў бессмяротнасць беларускай нацыі: «Бяссмертны ты, як фенікс, мой народ...» *[1, т. 8, кн. 1, с. 96–97]*.

У творах У. Караткевіча шмат яскравых апісанняў старажытных гарадоў, архітэктурных шэдэўраў. Гэта – адлюстраванне яго сталага захаплення гісторыяй і даўніной, клопату пра захаванне архітэктурнай спадчыны Беларусі, помнікаў нацыянальнага дойлідства.

ПАНАРАМА ГІСТАРЫЧНЫХ ПАДЗЕЙ

Наватарства У. Караткевіча як пісьменніка ў тым, што ён упершыню ў нацыянальнай літаратуры звярнуўся да вызначальных гістарычных падзей, раскрыў пераломныя моманты ў жыцці народа і Беларусі. На старонках гістарычных раманаў і аповесцяў творца праявіў сябе як выбітны філосаф гісторыі.



Уладзімір Караткевіч у час праходжання афіцэрскіх збораў на Ціхаакіянскім флоце. 1965 год

Пісьменнік стварыў бліскучую панараму падзей пачатку XVI стагоддзя, у якой зафіксаваў сутнасць эпохі, галоўныя ідэйныя канфлікты часу: «У той год Рым анафемствааў Лютэра і ўсіх, хто з ім, успамінаў праклёнам Арыя, Вальдэнса, чарнакніжніка Агрыпу, Гуса і Гераніма Пражскага і іншых ерэсіярхаў. У той год Масква ўспамінала анафемай Святаполка Акаяннага і ноўгарадскіх «жыдоўствуючых», якія адмаўлялі манастыры і царкоўнае землеўладанне і казалі, што Хрыстос і без біскупа ёсць Хрыстос, а біскуп без Хрыста – тфу, і нашто ён тады ўвогуле?» *[1, т. 6, с. 61]*.

У. Караткевіч рэзка раскрытыкаваў рэакцыйную сутнасць ордэна езуітаў. Паводле пісьменніка, слугі Лаёлы выкарыстоўвалі ўсе магчымыя сродкі дзеля ўмацавання касцёла, скіроўвалі намаганні найперш на авалоданне душамі дзяцей і юнакоў. Інтэлектуал асуджаў імкненне езуітаў да сусветнага панавання. У. Караткевіч негатыўна ставіўся да езуіцкай Контррэфармацыі ў гісторыі Еўропы. Ён даў вобразную, але дакладную ацэнку каталіцкага рэваншу: «Цёмнае ідзе, кроў ідзе, меч ідзе, атрута ідзе». Амаль у публіцыстычнай форме пісьменнік зазначыў, што агрэсіўнай стратэгіі езуітаў не наканавана зрэалізавацца. Ён станоўча ацэньваў змаганне з рэакцыяй, якое распачалі асветнікі і гуманісты: «Цёмныя і брудныя, нават фізічна, яны не думалі, што плаванне Калумба і выданне Скарынай Бібліі на зразумелай мове – ёсць два ўдары з серыі смяротных удараў, якія наносіць іхняй догме новы Чалавек» *[1, т. 6, с. 23]*.

Адна з галоўных тэм творчасці У. Караткевіча – нацыянальна-вызваленчае паўстанне 1863 года пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Праз мастацкія сродкі пісьменнік гістарычна праўдзіва раскрыў мэты і задачы паўстання, дакладна асвятліў яго характар і прычыны паражэння. Творца выявіў сутнасць разыходжанняў паміж палітычнай стратэгіяй К. Каліноўскага і польскім Белым жондам.

На старонках твораў У. Караткевіча знайшло адлюстраванне Крычаўскае паўстанне 1743–1744 гадоў пад кіраўніцтвам Васіля

Вашчылы. Гэтай значнай падзеі ў гісторыі Беларусі ён прысвяціў адмысловую п'есу «Маці ўрагану». У мастацкай форме аўтар выявіў сацыяльныя прычыны паўстання, гістарычна дакладна паказаў маштаб сацыяльнага пратэсту, у якім бралі ўдзел каля чатырох тысяч людзей. Вуснамі герояў п'есы пісьменнік прыгадаў колькасць і склад войска Гераніма Радзівіла – да 900 чалавек, якія былі кінуты на разгром паўстання. На старонках п'есы драматург намаляваў апакаліптычную сцэну задушэння паўстання, бязлітаснае пакаранне яго кіраўнікоў.

Такім чынам, У. Караткевіч выразна засведчыў, што паўстанні на Беларусі ў XVIII–XIX стагоддзях мелі не толькі сацыяльны, але і нацыянальна-вызваленчы характар. Сяляне і гараджане выступалі за свае палітычныя і нацыянальныя правы, супраць апалячанай шляхты і магнатаў. Высока ацэньваючы выступленні сялян і гараджан, іх змаганне за ўласныя правы, пісьменнік выразна ўсведамляў, што жорсткая і непрымірымая сацыяльная барацьба істотна аслабляла нацыю, рабіла Беларусь лёгкай здабычай для знешніх ворагаў.

Першарадная заслуга У. Караткевіча ў тым, што ён адным з першых у мастацкай практыцы ўвасобіў ідэю стварэння пантэона нацыянальных герояў. Выдатны майстар слова стварыў яркія вобразы змагароў і народных абаронцаў, якія ахвяравалі сабой дзеля волі, праўды і справядлівасці. Галоўны станоўчы вобраз у творах У. Караткевіча – Кастусь Каліноўскі – сапраўды культавая постаць нацыянальнай гісторыі. На старонках твораў пісьменніка Кастусь Каліноўскі паўстае як мужны і самаахвярны лідэр паўстання 1863 года, паслядоўны абаронца сацыяльных і нацыянальных правоў сялян-беларусаў. Кастусь Каліноўскі, як лідэр чырвонагу ўраду, лічыў непазбежным выкарыстанне тэрору супраць прыгнятальнікаў. Ён верыў ва ўсталяванне справядлівасці, вызваленне сялян ад прыгнёту, канчатковую перамогу дабра над сіламі зла. Узрушаны Кастусь прамаўляе: «А колькі мужыкоў ідзе з намі! І тут, і на Магілёўшчыне. І паўсюль. І паўсюль, дзе перамагае іхняя сіла, – у мужыкоў зямля, воля, мова, слава. І няма над імі ніякай улады, акрамя іхняй справядлівасці. Няма ўжо ні чыноўніка, ні пана, ні хама. Ёсць – Людзі» *[1, т. 8, кн. 1, с. 13]*.

Кастусь Каліноўскі ў творах пісьменніка – не бяскрылы анёл, не халодны і бессардэчны герой. Ён жывы чалавек, які сумуе і перажывае, радуецца жыццю, захапляецца прыгажосцю роднага краю. Кастусь бязмежна кахае Караліну, узносіць яе да нябёсаў. Для Кастуся Каліноўскага каханая Караліна і Беларусь знітаваныя ў адзінае. Яны – крыніца яго жыццёвай энергіі, веры і моцы. Герой гатовы аддаць жыццё, каб абараніць уласны гонар і годнасць нацыі. Урэшце ён сапраўды гіне дзеля каханай дзяўчыны і Радзімы.

Вельмі дарагі для У. Караткевіча вобраз Васіля Вашчылы, які з'яўляецца цэнтральнай фігурай п'есы «Маці ўрагану». Пачынаючы ўзброеную барацьбу, Васіль Вашчыла выразна ўсведамляе, што паўстанне можа быць жорстка задушана. Але ён гатовы загінуць, чымся далей зносіць здзекі, страшэнны прымус і катаванні: «Ды лепей паступіцца жыццём, чым сумленнем. Ведаю, справа толькі ў часе. Можа, мы не пратрымаемся і месяца, можа нас хопіць на некалькі год. Ды бывае так, што трэба гінуць» *[1, т. 8, кн. 1, с. 228]*. Словы Васіля Вашчылы бараніць Радзіму і гонар гучаць як заклік да ўсіх пакаленняў: «Ведаеш, мы часам павінны ахвяраваць сабой той маці-зямлі, што прыняла ў сябе тваю пупавіну і з часам прыме цябе. Можна жыць без жонкі і дзяцей, нават без бацькоў. Але немагчыма жыць без Радзімы» *[1, т. 8, кн. 1, с. 229–230]*. Застаючыся верным свайму выбару, Васіль Вашчыла ідзе да канца і гіне разам з іншымі паўстанцамі.

Уладзімір Караткевіч у час працы над фільмам «Дзікае паляванне караля Стаха» на кінастудыі Беларусьфільм. 1979 год

У. Караткевіч гнеўна выкрываў антынацыянальную і антынародную палітыку царскага ўрада на беларускіх землях. Ён намаляваў жахлівыя сцэны здзекаў і гвалту ўрадавых чыноўнікаў над беларусамі, асабліва над тымі, хто паўстаў «за сваю волю, веру, бацькаўшчыну». Пералік злачынстваў царызму ўражвае: рабаванне і спаленне цэлых вёсак, катаванні людзей, высылкі ў Сібір з малымі дзецьмі, ператварэнне квітнеючага краю ў бязлюдны могільнік. Вуснамі Кастуся Каліноўскага

аўтар выносіць прысуд царскай уладзе: «А вы, чорны колер, вы нават не колер. Вы – проста адсутнасць святла, смярдзючая чорная яма і гразь» *[1, т. 8, кн. 1, с. 81]*.

Пісьменнік выказваў упэўненасць, што за злачынствы, дзяржаўны бандытызм, сатанінскія ўчынкі і ганьбаванне цэлага народа цару і яго апрычнікам давядзецца расплачвацца спаўна. Герой паўстання Яўхім з абурэннем кажа:

А тое! Краем правіць Сатана.
Ты, капітан, і твой Мураш паскудны,
І ваша банда, і царок ваш снулы.
Ты пачакай, яму яшчэ за нас
Павытыргаюць ногі... *[1, т. 8, кн. 1, с. 60]*.

У. Караткевіч раскрыў глыбінныя працэсы зыходу з гістарычнай арэны некалі магутных шляхецкіх і магнацкіх родаў Беларусі. Як паказаў ён у сваіх творах, выраджэнне шляхты адбывалася надзвычай пакутліва і доўжылася амаль дзвесце гадоў, у XVIII і XIX стагоддзях. Яно суправаджалася матэрыяльным збядненнем, духоўнай дэградацыяй і маральным заняпадам шляхецкіх родаў. У «Дзікім паляванні караля Стаха» пісьменнік у вобразнай форме раскрыў асноўныя этапы і асвятліў важнейшыя праявы вымірання шляхты ў розныя перыяды. У. Караткевіч зусім не ідэалізаваў шляхту і магнатаў Беларусі, ён імкнуўся аб'ектыўна ацаніць яе ролю ў гісторыі краіны. Пісьменнік абураўся эгаізмам шляхецкага саслоўя, празмернай фанабэрлівасцю і прагнасцю князёў і магнатаў, іх поўнай абыякавасцю да лёсу народа і краіны.



Музей Уладзіміра Караткевіча ў Оршы

Менавіта абыякавасць шляхты і магнатаў да народа, бязлітасная эксплуатацыя працоўных сялян, на думку У. Караткевіча, прывялі краіну да заняпаду, голаду, здзічэння і вымірання. Выраджэнне і знікненне шляхецкага саслоўя – гэта лагічны вынік сацыяльнай бяздзейнасці шляхты, непазбежная праява яе ўнутранага распаду, дэмаралізацыі, лічыў майстар слова. Жахлівы стан, да якога дайшла шляхта, пісьменнік паказаў у сцэне святкавання паўналецця Надзеі Яноўскай. З'езд шляхты ў палацы Яноўскіх намаляваны пісьменнікам у карыкатурым святле. Адны з гасцей выскаляліся «як выхадцы з магілы», пра духоўную спустошанасць іншых сведчыла іх аблічча. Перараджэнне шляхты яскрава паказана на прыкладзе пана Дубатоўка – «рыцара начных разбояў і воўчага сонца», які арганізаваў дзікае паляванне і з яго дапамогай тэрарызаваў усё наваколле. Аўтар прыйшоў да несуцяшальнай высновы, што гэтую пароду трэба знішчыць, бо «яна пачала смярдзець на ўвесь свет».

Пры звароце да гістарычнай тэматыкі і ўзнаўленні гістарычных рэалій У. Караткевіч выявіў незвычайную дакладнасць і аб'ектыўнасць. Ён выдатна ведаў уладкаванне старажытных гарадоў і мястэчак, замкаў і палацаў, адметных геаграфічных мясцін. Асаблівае месца майстар слова адводзіў тапаграфіі Гародні. Пісьменнік зрабіў вобразнае і пры гэтым амаль прафесійнае апісанне Гарадзенскага замка, узведзенага за часамі Вітаўта. У. Караткевіч прадэманстраваў унікальнае веданне гісторыі нацыянальнай культуры, тэатра, літаратуры, музыкі. Ён паказаў дзейнасць на Беларусі вандроўных акцёраў і блазнаў, з'яўленне ў XVI стагоддзі першых прафесійных тэатраў.

КУЛЬТУРА НАРОДА

Шмат месца ў творчасці У. Караткевіча адводзіцца сялянскай і гарадской карнавальнай культуры, у якой выявілася багатая фантазія народа. Яго творы насычаны дзівоснымі здарэннямі, напаўлегендарнымі сюжэтамі і забаўляльнымі гісторыямі. Раман «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» – суцэльны карнавал, містэрыя і буфанада, неўтаймаваная стыхія гумару і смеху, што найлепшым чынам адлюстроўвала дамінантныя рысы эпохі. З'яўленне ў Гародні «13 апосталаў» выглядае як неверагодная містыфікацыя, тэатральная дзея.

Увасабленне карнавальнай культуры Беларусі – галоўны герой «Ладдзі роспачы», яркі і самабытны Гервасій Выліваха. Ён нарадзіўся ў Рагачове, належаў да дваранскага роду, знешне быў прыгожы і пяшчотны, але вёў неверагодна распусны лад жыцця: «Хобаль, залётнік, піяка, задзіра, біток». Разам з сябрамі Гервасій бясконца п'е віно ды «дзярбаніць на лютнях і кімвалах

багамерзкія песні». Герой увесь час заляцаецца да жанчын, ніводная з прыгажунь не магла ўстаяць перад ім: «Калі б перад каралём Цыкмунам пала столькі замкаў, колькі перад ім жонак – кароль бы ўладарыў паловаю свету» *[1, т. 2, с. 133]*. Гервасій спакусіў нават жонку магілёўскага войта і ігуменню Азярынскага манастыра, але ніхто не мог яму нічога зрабіць. Каралева Бона, наведваючы Рагачоў, хацела адвесці Гервасія ад «ерасі», але і яна не ўстаяла перад ім, згадзілася з яго прапановай «паглядзець гэты свет».

Гервасій Выліваха не прызнае хрысціянскай маралі, адкрыта здзекуецца з рэлігійных догматаў. Калі яго ўчынкі асудзіў біскуп, дык Гервасій і яго сябры не разгубіліся, а перайшлі ў наступ: «І догмат бясхібнасці Бога падсеклі пад корань, кажучы, што нават ён робіць шмат непатрэбнага на гэтай зямлі. Напрыклад, цыцкі ў мужчын. Не было яшчэ на свеце мужчыны, якому б яны хоць раз спатрэбіліся» *[1, т. 2, с. 133–134]*. Весялун, аптыміст і жартаўнік Гервасій Выліваха перамагае нават смерць, ён абыгрывае яе ў шахматы і з каханай вяртаецца да шчаслівага і бестурботнага жыцця. Паводле высновы пісьменніка, права на жыццё маюць тыя, хто па-сапраўднаму любіць зямныя каштоўнасці, хто не баіцца смерці, смела прымае розныя выклікі і мужна, з усмешкай пераадольвае перашкоды і бар'еры.

На старонках твораў У. Караткевіча знайшлі адлюстраванне народныя абрады, гульні і забавы як істотныя праявы карнавальнай культуры. У п'есе «Кастусь Каліноўскі» пісьменнік згадвае язычніцкі абрад «калка», гульню ў «яшчура».

ГІМН КАХАННЮ І ЖАНЧЫНЕ

Караткевіч стварыў сапраўдны гімн каханню і жанчыне. Майстар слова ўзнёсла апявае прыгажосць жанчыны, захапляецца прывабным унутраным светам лепшай часткі чалавецтва. На старонках яго твораў – галерэя цудоўных жаночых вобразаў, гераічных, абаяльных, клапатлівых, адданых. Паводле У. Караткевіча, каханне – найвялікшая каштоўнасць на зямлі, дзеля якой варта жыць і змагацца. За сапраўднае каханне, лічыў ён, «не шкода аддаць і жыццё». У лірычным апавяданні «Блакіт і золата дня» пісьменнік раскрыў яркія грані кахання, яго чароўнае святло, якое дае жыццё і прыносіць сапраўдную радасць быцця.

Гераіня рамана «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» Марына Крывіц уражвае дзіўнай прыгажосцю, грацыёзнасцю і абаяльнасцю: «Кабета была сапраўды гожая. Непамерныя чорныя вочы, доўгія, як стрэлы, веі, вішнёвы малы раток, снежнай белі і пяшчотнасці скура аблічча і дзіцячых рук. Гнуткая, як змяя, з высокімі невялікімі грудзьмі, яна сядзела ў сваёй нязручнай паставе грацыёзна, гнутка» *[1, т. 6, с. 16]*. У апавяданні «Залаты бог» пісьменнік паказаў загадкавы і бясконцы свет кахання, яго таямнічыя праявы. У. Караткевіч, насуперак распаўсюджаным міфам, імкнуўся давесці, што мужчыны здатныя кахаць глыбока і шчыра, высакародна і самааддана. Галоўны герой апавядання Валеры Палецкі моцна кахае Агату, гатовы дзеля яе зрабіць немагчымае. Пісьменнік паказаў, што каханне – не заўсёды асалода, яно нярэдка суправаджаецца пакутамі, болем, сумненнямі: «Мы, беларусы, рэдка ўмеем кахаць па-сапраўднаму, не ахвяруючы чымсьці, і я не быў выключэннем з правіла. Звычайна мы мучаем тую, якую кахаем, а самі мучымся яшчэ больш ад розных супярэчлівых думак, пытанняў, учынкаў, якія іншымі вельмі лёгка прыводзяцца да аднаго знамянальніка» *[1, т. 7, с. 123]*. Такім чынам, нацыянальная гісторыя і неабсяжны свет кахання з'яўляліся для У. Караткевіча невычэрпнымі крыніцамі творчай фантазіі.



Уладзімір Калеснік і Уладзімір Караткевіч у Белавежскай пушчы. 1971 год

БЛІСКУЧЫ ЛІТАРАТАР

Уладзімір Караткевіч – геніяльны майстар слова, бліскучы літаратар. Ён узбагаціў важнейшыя роды, віды і жанры беларускай літаратуры новымі тэмамі, сюжэтамі і вобразамі, адмысловымі літаратурнымі прыёмамі, стварыў сінкрэтычныя мастацкія формы.

Празаічныя творы пісьменніка – раманы, аповесці і апавяданні – вылучаюцца наяўнасцю прыгодніцкага сюжэта, выкарыстаннем дэтэктыўных элементаў, што стварае ўнутранае напружанне, загадкавасць і прывабнасць. Літаратурныя героі

сутыкаюцца з невядомым і таямнічым, забойствамі і злачынствамі, пераадольваюць розныя бар'еры, разгадваюць складаныя рэбусы. Яны змагаюцца за высокія ідэалы, гінуць і перамагаюць. Вельмі часта пісьменнік звяртаецца да легендарнага і міфічнага, стварае незвычайныя вобразы, якія ўзыходзяць да персанажаў нацыянальнага фальклору.

Выдатныя драматургічныя творы У. Караткевіча прызначаліся, хутчэй, для чытання, чымся для пастаноўкі ў тэатры. Ім уласціва значная працягласць у часе, дзеянні адбываюцца на шырокай геаграфічнай прасторы, у розных вёсках, гарадах і нават краінах. Так, падзеі ў п'есе «Кастусь Каліноўскі» доўжацца ад мая 1863 года да сакавіка 1864-га, яны адбываюцца па ўсёй Беларусі – у вёсцы Бахарэвічы, у гарадах Вільні, Менску, Санкт-Пецярбургу. Падзеі «Маці ўрагану» гэтаксама ахопліваюць значны перыяд, ад 1743 да 1744 года; яны адбываюцца ў Белай Падляшскай, Цэркавішчы, Крычаве, а таксама лакалізуюцца ў шмат якіх месцах – у пячоры, у карчме Магды Мякенькай, у палацы Гераніма Радзівіла, у полі пад Цэркавішчамі, на плошчы перад Крычаўскім замкам.

Ля помніка Уладзіміру Караткевічу ў Оршы

Паэтычныя творы У. Караткевіча разнастайныя паводле тэматыкі і жанравых форм. Сярод вершаваных здабыткаў майстра слова дамінуюць лірычныя вершы, балады, пейзажныя замалёўкі. Шэраг вершаваных твораў надзвычай пафасныя, філасофскія паводле зместу. Для іх якраз у найбольшай ступені характэрны патрыятычныя і грамадзянскія матывы.

У. Караткевіч бліскуча валодаў комплексам універсальных літаратурных прыёмаў. Неацэннай эстэтычнай каштоўнасцю ён лічыў фальклор, які ахвотна вывучаў і скарыстоўваў у мастацкай практыцы. Майстар слова вельмі дбайна ставіўся да неабходнасці вывучэння фальклорнай спадчыны і надзейнага захавання шэдэўраў нацыянальнай вуснай творчасці, у якіх зафіксавана тысячагадовая мудрасць і жыццёвы досвед народа. Ён выказваў глыбокую занепакоенасць станам збірання фальклору і балюча перажываў з-за незваротных страт унікальных твораў. Пісьменнік адзначаў незвычайную разнастайнасць беларускіх народных легендаў і паданняў, іх выключную мастацкую каштоўнасць, невычэрпны вобразна-сімвалічны патэнцыял і шматкроць звяртаўся да іх у сваёй творчасці. Ён асабліва вылучаў легенды пра вужыную каралеву, пра бурштынавы палац, пра з'яўленне асобных камянёў, пра назвы вёсак, урочышчаў, пячораў.

У аснову аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха» пакладзена легенда пра вольналюбівага Стаха Горскага, які хацеў стварыць незалежнае беларускае каралеўства, але быў забіты ўплывовым магнатам Раманам Яноўскім. Выразна міфічную прыроду мае сціслая гісторыя пра паходжанне назвы людзей крывіцкага роду, якіх называлі «адарвірогі». Паводле пісьменніка, продкі беларусаў некалі пазбавілі Люцыпара рога, які, як аказалася, меў цудадзейныя ўласцівасці: «У самога Люцыпара рог сілком аддзерлі і зрабілі з яго келіх для пітва. Вады нальеш, і, сілаю самога рога, робіцца гарэлка» *[1, т. 2, с. 130]*. У «Ладдзі роспачы» змешчана каларытная легенда пра ўваход у пекла, які знаходзіўся на дне Равучага возера каля ракі Іпуць. Надзвычай шмат народных паданняў У. Караткевіч змясціў у рамане «Каласы пад сярпом тваім». Асабліва яркае з іх – пра «балотных паноў», чарцей, якія заводзяць людзей у багну або на віселіцу. Паданне пра сустрэчу з «дзядамі» напоўнена неверагоднымі і дзівоснымі здарэннямі.

Пісьменнік шырока выкарыстоўваў жніўныя і вясельныя песні, плачы і прыпеўкі. Народна-песенныя матывы і вобразы надавалі асаблівы каларыт творам У. Караткевіча, істотна ўзбагачалі іх мастацкія вартасці.

Распаўсюджаны мастацкі прыём, які ён часта выкарыстоўваў – уключэнне ў тканку празаічных твораў уласных песень і вершаў. Так, Гервасій спявае арыгінальныя аўтарскія песні, напоўненыя жыццёвым аптымізмам, радасцю і святлом.

Для выкрыцця адмоўных грамадскіх з'яў і памылковых уяўленняў У. Караткевіч удала выкарыстоўваў магчымасці гратэску, сарказму і іроніі. У рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» прадстаўнікі касцёла і царквы судзяць мышэй. Паводле іх аб-

сурднай логікі, усё створана Богам, а яны, як яго адзіныя прадстаўнікі, павінны ўсё кантраляваць, за ўсім сачыць і жорстка караць адступнікаў: «Лотр успамінае ўсе такія працэсы. Што зробіш, Богу падпарадкоўваюцца і жывёлы, хаця іхняя душа тануткая, зусім празрыстая і не мае перад сабою вечнасці і бяссмерця. Судзілі год сто назад у Рыме чорнага ката алхіміка... як бо ж яго... ну, усё адно. Павесілі. Судзілі разам з гаспадаром, лекарам Карнеліусам з Майнца, ягонага барана, у якога ўсяліўся дэман. Судзілі год пяцьдзесят таму ў Францыі Сулара і ягоную свінню. Яго спалілі, яе закапалі ў зямлю. Дэману, ворагу роду чалавечага, нельга патураць, нават калі ён знаходзіць сабе прыстанак у бесславеснай істоце. Судзілі ўжо і мышэй, у Швейцарыі. І казлоў судзілі і палілі. Гэтых часцей за ўсё. За схожасць з чортам» *[1, т. 6, с. 34 – 35]*. Надзвычай камічна выглядае прысуд, вынесены мышам: ім загадана на працягу месяца пакінуць горад і княства. А каб мышы бесперашкодна адбылі з краіны, ім выдалі ахоўную грамату ад нападаў катоў і варон. Скрутак з выракам засунулі ў мышыную нару, адкуль пачуўся сатанінскі віск і радасная валтузня, бо мышы пачалі грызці рашэнне суда. Знішчальная сатыра драматурга на царкву і святароў даецца ў дыялогу п'яных папоў у п'есе «Маці ўрагану».

Уладзімір Караткевіч. 1980 год

У. Караткевіч высока ацэньваў эстэтычныя вартасці народных жартаў і гумару, шырока выкарыстоўваў іх мастацкі патэнцыял у літаратурнай практыцы. Паводле філасофіі пісьменніка, жарты і смех для чалавека – гэта «імяніны сэрца». Героі твораў У. Караткевіча сапраўды шмат жартуюць, яны не губляюць аптымізму нават у безвыходных і трагічных сітуацыях. Увядзенне ў мастацкія творы досціпаў і жартаў дапамагалі аўтару раскрыць духоўны патэнцыял герояў, іх аптымізм, трываласць у жыцці.

Творы У. Караткевіча вельмі густа засеяны дасціпнай народнай лаянкай, незлаблівымі знявагамі, сваркамі і спрэчкамі герояў, сакавітымі праклёнамі і пагрозамі, што стварала камічны эфект, дазваляла праўдзіва і рэалістычна выявіць сутнасць характараў і вобразаў.

Творам У. Караткевіча ўласціва інтэртэкстуальнасць. Пісьменнік вельмі часта звяртаецца да Бібліі, біблейскіх сюжэтаў і вобразаў, а таксама рэлігійных тэкстаў. Яго героі прамаўляюць псалмы, цытуюць выказванні з евангелляў, спяваюць трапары і моляцца.

У. Караткевіч – майстар партрэта. Ён выдатны знаўца фізіягномікі, што цудоўна пацвярджаецца адметным партрэтам пані Кульшы. Запамінальны і каларытны партрэт шляхціца-волата Грыня Дубатоўка. Пісьменнік акцэнтуе ўвагу на яго памерах, манеры рухацца, вопратцы і паводзінах. Гарадзенскі войт Цыкмун Жаба – нават вонкава агідная асоба. Праваслаўны епіскап Гіляр Балвановіч гэтаксама мае непрывабнае аблічча, што цалкам адлюстроўвае яго ўнутраную сутнасць. Праз знешнія рысы асобы пісьменнік паказваў праявы характару, унутраны свет і псіхалогію герояў.

Як бліскучы наратар, У. Караткевіч надаваў выключнае значэнне мастацкай дэталі, што асабліва выявілася ў шматфарбных апісаннях старадаўніх палацаў і замкаў, зброі і вайсковага рыштунку, прадметаў народнага побыту і вопраткі, нацыянальных страў, напояў і танцаў.

Пісьменнік шырока выкарыстоўваў багатую палітру вобразных і моўных сродкаў. Творы майстра слова насычаны сімволікай. Адзін з найбольш значных яго сімвалаў – «ураган», які ўжываецца ў значэнні народнага гневу, абурэння, разбуральнай моцы і неўтаймаванай стыхіі. Для характарыстыкі варожых, антынародных сіл пісьменнік скарыстоўваў сімвалы «савы», «ваўкоў», «дзікоў». Вобразы «хата», «сала», «соль», «хлеб» сімвалізуюць дастатак, дабрабыт і заможнае жыццё. «Гадзюка» выступае сімвалам эксплуататараў і памешчыкаў. Вобраз Жанчыны ў п'есе «Кастусь Каліноўскі» сімвалізуе Беларусь.

Такім чынам, праз мастацкія вобразы і яркія характары У. Караткевіч бліскуча сфармуляваў уласную філасофію жыцця, сцвердзіў гуманістычныя ідэалы і каштоўнасці, раскрыў сацыяльныя і грамадскія працэсы.

ЛІТАРАТУРА

1. Караткевіч, У. Збор твораў: у 8 т. / У.Караткевіч. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1987–1990.